Опираясь на эти данные, можно с большой долей вероятности предположить, что Китай по-прежнему будет одним из лидеров в привлечении иностранных инвестиций, как в финансовый сектор, так и в реальный.

## ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ АДНОСІНЫ (2004-2008 ГГ.)

**Д. П. Пінькевіч**

Рэспубліка Польшча і Літоўская Рэспубліка прайшлі няпросты шлях насустрач адна адной. За 14 год, што папярэднічалі ўступленню гэтых дзяржаў у Еўрапейскі Саюз, у двухбаковых адносінах адбыліся каласальныя змены. Калі ўвосень 1991 г. літоўскі міністр абароны ахарактарызаваў Польшчу як «галоўную пагрозу нацыянальнай бяспецы», то ў канцы 2004 г. літоўскія дэпутаты юрыдычна зафіксавалі за Польшчай статус стратэгічнага партнёра. Натуральна, што за гэты час польскаму і літоўскаму народам давялося прайсці няпросты шлях пераадолення ўзаемных прэтэнзій, якія выцякалі з негатыўнага гістарычнага досведу.

З моманту ўступлення Літвы і Польшчы ў ЕС у маі 2004 г. пачаўся якасна новы этап узаемадзеяння краінаў. За апошнія чатыры гады іх ўрады неаднаразова давалі сумесныя адказы на выклікі, што сыходзілі як з-за межаў саюза, так і ўнутры яго, што дазваляе канстатаваць новы ўзровень супрацоўніцтва.

Разгляд знешняй палітыкі абедзвюх дзяржаў дае нам падставу вылучыць два чыннікі, што істотна ўплываюць на фармаванне гэтай палітыкі як ў Літоўскай Рэспубліцы, так і ў Рэспубліцы Польшча.

Па-першае, як Польшча, так і Літва надаюць асаблівае значэнне адносінам са Злучанымі Штатамі. Гэта добра бачна па шматлікіх сустрэчах афіцыйных прадстаўнікоў Вільні і Варшавы з амерыканскімі калегамі, а таксама па тым ўплыве, які аказваюць вынікі такіх сустрэч на палітыку абедзвюх краін. Праз гэта погляды літоўскіх і польскіх палітычных дзеячаў на міжнародныя падзеі часам супадаюць нават без папярэдняга ўзаемнага ўзгаднення. Па факце Вільня і Варшава проста рэалізуюць асабістыя дамоўленасці з Белым домам.

Па-другое, абедзве краіны вылучаюцца традыцыйнай падазронасцю да свайго ўсходняга суседу – Расійскай Федэрацыі. Абапіраючыся на вельмі негатыўны гістарычны досвед адносінаў з Расіяй яшчэ з часоў Расійскай Імперыі, і далей ў часы Імперыі Савецкай, і польскі, і літоўскі народы прызвычаіліся чакаць з Усходу ўдару ці здрады. Таму можна

канстатаваць, што знешняя палітыка Літвы і Польшчы ў шырокім сэнсе носіць выразны антырасійскі характар.

Менавіта гэты падыход пасля ўваходжання краін у ЕС даволі добра рэалізоўваўся пасродкам механізмаў Еўрасаюзу. Так, з лістападу 2006 г. спачатку Польшча, а потым і Літва заблакавалі зацвярджэнне мандату на пачатак перамоваў аб пагадненні «Расія – ЕС». Шляхам блакавання абедзве краіны дамагліся выканання расійскім бокам іх першапачатковых патрабаванняў.

Разам з тым, з восені 2007 г. ва ўнутрыпалітычнай абстаноўцы як Польшчы, так і Літвы мелі месца істотныя змяненні. Пасля парламенцкіх выбараў у кастрычніку 2007 г. найбольш уплывовай партыяй у польскім Сойме стала «Грамадзянская платформа» Д. Туска, якая выступіла як асноўная альтэрнатыва «Праву і Справядлівасці» братоў Качыньскіх. У Літве у лістападзе 2008 г. да ўлады прыйшоў кансерватыўны «Саюз Айчыны».

Асноўныя ж змены адбыліся ў паводзінах Польшчы на міжнароднай арэне. Калі ў Літве фармаванне знешняй палітыкі адносіцца да паўнамоцтваў прэзідэнта краіны, дык у Польшчы, паводле 146 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі, гэтыя паўнамоцтвы ўскладаюцца на прэм’ер-міністра. А пазіцыі Я. Качыньскага і Д. Туска, адпаведна былога і дзеючага прэм’ер-міністраў Польшчы, у знешняй палітыцы істотна адрозніваюцца. Так, Д. Туск адной са сваіх галоўных мэтаў бачыць нармалізацыю адносінаў з Масквой.

Яскравай праявай зменаў у знешняй палітыцы дзвюх дзяржаў стаў расійска-грузінскі ўзброены канфлікт. У той час, як польскі прэзідэнт Л. Качыньскі разам са сваім літоўскім калегам В. Адамкусам вельмі жорстка выступаў супраць паводзінаў Расійскай Федэрацыі, польскі прэм’ер-міністр, які прэзэнтуе пазіцыю Польшчы па міжнародных пытаннях, выказваўся значна больш стрымана і нават дэзавуіраваў некаторыя выказванні прэзідэнта, нагадваючы, што за знешнюю палітыку ў краіне ўсё ж такі адказвае прэм’ер.

Працягам гэтых зменаў стала галасаванне на нарадзе міністраў замежных спраў ЕС, прысвечанай зацвярджэнню мандату на пачатак перамоваў па новым пагадненні «ЕС – Расія». Перед пачаткам вайны ў Грузіі Літва і Польшча далі згоду на пачатак працы над пагадненнем. Але пасля жніВеньскіх падзеяў і польскія, і літоўскія палітыкі паставілі пытанне аб немагчымасці пачатку перамоваў у сітуацыі, калі расійскія войскі знаходзяцца на тэрыторыі Грузіі. Але ж на самой нарадзе польская дэлегацыя не стала блакаваць пачатак перамоваў, пакінуўшы стратэгічных партнёраў у адзіноце.

Усё гэта дазваляе вызначыць новы этап у двухбаковых адносінах Літвы і Польшчы. Абодва фундаментальныя кансалідуючыя знешнепалітычныя чыннікі, характэрныя гэтым краінам, апынуліся пад уплывам пэўных перамен. Калі казаць пра адносіны кожнай краіны са Злучанымі Штатамі, то варта адзначыць, што новая дэмакратычная адміністрацыя Белага Дома, відавочна, менш увагі надае краінам г.зв. «Новай Еўропы», сярод якіх знаходзяцца Польшча і Літва. Апрача таго, традыцыйна моцны кансалідуючы антырасійскі фактар пачынае губляць сваю надзейнасць па прычыне змянення бачання адносінаў з Расійскай Федэрацыяй з боку польскага урада.

## РЫНОК ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ

**Р. Проскалович**

Рынок интеллектуальной собственности играет одну из ключевых ролей в современной экономике, оказывает влияние на развитие большинства сфер хозяйствования. Интеллектуальная собственность уже давно стала стратегическим ресурсом, который определяет успех почти любого предприятия и часто оценивается значительно выше его материальных активов. Особенно ярко это проявляется на современном этапе, в период формирования обществ потребления и информационных обществ.

При этом в процессе функционирования рынка интеллектуальной собственности возникает ряд проблем, которые тормозят развитие не только данной сферы, но и экономики в целом. Среди них следует особо выделить проблемы, связанные с пиратством и производством контрафактной продукции; низким процентом коммерческой реализации прав в сфере промышленности; соблюдением баланса между интересами создателей и потребителей интеллектуального продукта. Особого внимания также заслуживают вопросы оценки интеллектуальной собственности и патентного взаимодействия на международном уровне. Исследование и решение вышеуказанных проблем – одна из перспективных задач современной экономической науки.

Существование проблемы пиратства и производства контрафактной продукции обусловлено рядом фактором. Современный уровень техники позволяет довольно легко копировать и воспроизводить результаты интеллектуальной деятельности. Интеллектуальная собственность, объектом которой в первую очередь выступает новая информация, является нематериальным активом, который достаточно сложно защитить. Производство контрафактной и поддельной продукции гораздо дешевле законного производства, т. к. не предусматривает покупки прав на использо-